# * Прыкладныя тэмы гістарычных праектаў і даследаванняў да раздзела IV «Беларусь і цывілізацыі свету ў перыяд ранняга Новага часу»

1. Па слядах Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.
2. Фарміраванне каланіяльных імперый і іх уплыў на сусветныя рынкі.
3. Асаблівасці развіцця паўночнаамерыканскіх калоній і іх узаемадзеянне з карэннымі народамі.
4. Людовік XIV: кароль-сонца або тыран?
5. Рост магутнасці Асманскай імперыі: Сулейман Пышны і яго эпоха.
6. Англійская рэвалюцыя XVII ст.: ад манархіі да парламента.
7. Пятроўскія пераўтварэнні і іх уплыў на расійскае грамадства.
8. Мануфактуры і першыя крокі капіталістычнай эканомікі.
9. Ост-Індскія кампаніі: улада карпарацый над сусветам.
10. Капіталізм: нараджэнне новага эканамічнага парадку.
11. Кітай і Японія ў раннім Новым часе: ізаляцыянізм і знешні ўціск.
12. Індзейцы Амерыкі да прыходу еўрапейцаў: цывілізацыі ма́я, ацтэкаў і інкаў.
13. Вестфальскі мір і фарміраванне сістэмы міжнародных адносін.
14. Роля рэлігійных войнаў у фарміраванні палітычнай карты Еўропы.
15. Рэфармацыя і Контррэфармацыя: рэлігійны раскол Еўропы.
16. Навуковая рэвалюцыя: Г. Галілей, І. Ньютан і новыя погляды ведаў.
17. Леанарда да Вінчы: геній на ўсе часы.
18. Барока: раскоша і веліч у кожнай рысе.
19. Рэлігійныя і міфалагічныя тэмы ў мастацтве Адраджэння.
20. Філосафы Асветніцтва (Мантэск'ё, Вальтэр, Русо) і іх унёсак у развіццё ідэй правоў чалавека.
21. Лёсы вялікіх палкаводцаў: лідары, што змянілі ход гісторыі.
22. Кадыфікацыя права: Статуты ВКЛ і іх значэнне для прававой сістэмы.
23. Гандлёвыя шляхі і кірмашы: сувязь Беларусі з Еўропай.

24. Палкаводцы ВКЛ: Канстанцін Астрожскі і яго перамогі.
25. Францыск Скарына — вобраз першадрукара: праўда і міфы.
26. Паслядоўнікі Францыска Скарыны: працяг традыцый кнігадрукавання і асветніцтва ў Беларусі.
27. Берасцейская унія 1596 г.: перадумовы і наступствы.
28. Леў Сапега: дзяржаўны дзеяч і рэфарматар.
29. Выдатныя жанчыны Беларусі XVI–XVIII стст.: лёсы, дасягненні і ўнёсак у гісторыю.
30. Замкавыя комплексы Беларусі: Мірскі і Нясвіжскі замкі.
31. Сем цудаў Беларусі XVI–XVIII стст.: архітэктурная спадчына.
32. Народныя строі і ўпрыгажэнні: сімволіка і рэгіянальныя асаблівасці.
33. Адлюстраванне падзей XVI–XVIII стст. на тэрыторыі Беларусі ў жывапісе, літаратуры, кінематографе.